За шматгадовую актыўную грамадскую дзейнасць, значны асабісты ўклад у гераіка-патрыятычнае выхаванне моладзі, развіццё ветэранскага руху і рэалізацыю сацыяльнай палітыкі Рэспублікі Беларусь старшыня Браслаўскага раённага грамадскага аб'яднання «Беларускі саюз ветэранаў вайны ў Афганістане» Леанід Мікшта ўзнагароджаны Граматай Дзяржаўнага сакратарыята Савета Бяспекі Рэспублікі Беларусь.

# Важкая ўзнагарода



Л. Мікшта паведаміў, што, як і іншым ветэранам, уручыў яму ўзнагароду Дзяржаўны сакратар Савета Бяспекі Аляксандр Вальфовіч на ўрачыстым сходзе, прысвечаным Дню памяці воінаў-інтэрнацыяналістаў і 35-годдзю вываду савецкіх войскаў з Афганістана, які адбыўся 10 лютага ў Цэнтральным Доме афіцэраў.

У дадзеным мерапрыемстве прымалі ўдзел міністр абароны Віктар Хрэнін, намеснік Галавы Адміністрацыі Прэзідэнта Ігар Луцкі, а таксама прадстаўнікі дзяржаўных органаў і арганізацый, дэлегацыі воінаў-інтэрнацыяналістаў з усіх абласцей і г. Мінска, ваеннаслужачыя Мінскага гарнізона. Сярод гасцей урачыстага сходу былі і школьнікі, выхаванцы патрыятычных клубаў, курсанты Ваеннай акадэміі. ■

*Тэкст і фота* **Казіміра ПЯТУШКІ.**